# НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

Кнігі народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў чытачоў. І не толькі ў беларусаў. З задавальненнем знаёмяцца з імі на сваёй роднай мове рускія і украінцы, латышы і літоўцы, палякі і чэхі, англічане і немцы, прадстаўнікі іншых нацый. У многіх краінах гучыць неўміручае слова слаўных сыноў Беларусі, якія ўсё свядомае жыццё сваё і творчасць прысвяцілі служэнню роднаму народу.

Творчая спадчына Купалы і Коласа непадуладна часу. Аб гэтым яскрава сведчаць наступныя лічбы. Больш трохсот разоў тыражом звыш шасці мільёнаў экземпляраў выдаваліся ў нашай рэспубліцы іх творы. На мовах жа народаў СССР выйшла 116 кніг агульным тыражом амаль сем мільёнаў экземпляраў.

Аб гэтым гаварыў на адкрыцці ў Доме кнігі ў Мінску выстаўкі кніг, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, старшыня Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю М. І. Дзялец. Народныя песняры, зазначыў ён, закладвалі падмурак новай беларускай літаратуры. За гэта мы заўсёды будзем удзячны ім. І сёння слова Купалы і Коласа жыве з намі ва ўсіх нашых справах, служыць справе міру і камунізму.

Да прысутных звярнуўся сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Барыс Сачанка. Спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа, падкрэсліў ён, гэта жыватворная крыніца. Яна і сёння такая ж чыстая і свежая, якой была і пры жыцці народных паэтаў. Іхнія творы — гэта словы самога народа, таму не дзіўна, што народ іх успрымае як свае.

Стогадовыя юбілеі народных песняроў Беларусі, якія мы сустракаем напярэдадні 60-годдзя СССР, у небывалым росквіце культуры і літаратуры, сацыялістычных па змесце і нацыянальных па форме, гавораць пра немалую нашу гісторыю, пра глыбокія нашы карэнні, пра плённасць і жывучасць ідэй і спраў Янкі Купалы і Якуба Коласа, шматлікія ж выданні і шматтысячныя тыражы іх твораў сведчаць пра іх папулярнасць.

Ткачыха Мінскага камвольнага камбіната, дэлегат XIX з'езда ВЛКСМ Марыя Мароз расказала, як любяць творчасць народных песняроў рабочыя, гаварыла пра тыя мерапрыемствы, што былі праведзены на камбінаце ў сувязі з падрыхтоўкай да юбілеяў Купалы і Коласа.

...Дзесяткі, сотні кніг у цікавай, змястоўнай і багатай экспазіцыі. І не толькі кніг. З хваляваннем прагладаюць шматлікія наведвальнікі камплекты газет «Наша ніва» і «Наша доля», са старонак якіх гучала слова песняроў. Спыняюцца, каб бліжэй пазнаёміцца з кнігамі Купалы «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця», «Спадчына», а таксама з першымі выданнямі твораў Коласа.

Гэтыя і многія іншыя прыжыццёвыя выданні кніг народных песняроў прапанавалі для выстаўкі супрацоўнікі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. Што тычыцца выданняў апошняга часу, дык своеасаблівая купалаўская і коласаўская бібліятэка цяпер, калі праходзіць юбілейны год песняроў, рэгулярна папаўняецца. У экспазіцыі кніга «Успаміны пра Янку Купалу», зборнік «Нам засталася спадчына», у якім змешчаны вершы, прысвечаныя паэтам, альбомы «Вязынка», «Янка Купала ў творчасці мастакоў», якія выйшлі з друку літаральна на днях.

І, вядома ж, вялікае значэнне надаецца выпуску збору твораў песняроў. Чатырнаццацітомнік Якуба Коласа і сямітомнік Янкі Купалы даюць магчымасць чытачам адчуць багацце і шматграннасць творчай спадчыны класікаў беларускай савецкай літаратуры.

●

На адкрыцці выстаўкі прысутнічала намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Снежкова.



Госці і беларускія пісьменнікі на Кургане Славы.

Фота Ул. КРУКА.